# ***Заданні па тэме “Правапіс літар і, ы, й пасля прыставак”***

**Заданне № 1. Спішыце словы, уставіўшы прапушчаныя літары.**

1. Пра..нструктаваць, с..граць, транс..арданскі, па..шоў, пера..грыванне, дэз..нфармацыя, раз..шоўся, мед..нстытут, за..скрыцца, пад..спытны, між..нстытуцкі, ня..накш, пера..грываць. пра..снаваць, пера..маць, ува..шоў, за..канне, пад..граць, пра..гравальнік, па..менна, контр..гра, пра..люстраваць.

2. Звыш..ндустрыялізацыя, ад..ходзіць, за..нелы, ад..мжэць, за..нтрыгаваць, аб..грываць, без..ніцыятыўны, вы..грыш, дэз..нфекцыя, за..грыванне, пан..сламізм, борт..нжынер, сан..нструктар, пад..ход, паліт..нфармацыя, гіпер..нфляцыя, уз..сці, пра..снаваць, аўта..нспекцыя, гука..заляцыя, з..мправізаваць, да..мперыялістычны.

**Заданне № 2. Спішыце сказы, устаўце прапушчаныя літары. Растлумачце правапіс ўстаўленых літар.**

1. Добра ў ясны зімовы дзень пра...сціся на лыжах за горад (Б. Сачанка). 2. Пры..шоў у лес садоўнік, убачыў яблыньку і выкапаў яе (Б. Сачанка). 3. Колькі на нашай зямлі без..менных герояў, сціплых і простых!
4. Аляксей пра..шоў некалькі крокаў і наступіў на лоўжык сухога ламачча. (С. Грахоўскі). 5. Нарэшце сонца ўз..шло, за..скрылася раса на маладой атаве. 6. Першыя трывогу пад..маюць буслы (Я. Колас). 7. Лета толькі над..шло, а мурашкі пачалі ўжо рыхтавацца да зімы. 8. Міхась і не заўважыў, як пра..шоў першы дзень навукі.

**Заданне № 3. Прачытайце ўрывак з верша С. Чыгрынава “Удава”. Вызначце яго тэму.**

Чакала з вайны – не прыйшоў.
Чакае з вайны – не прыходзіць…
І дзесяць гадоў прайшло,
І дваццаць гадоў праходзяць.
Наймае касцоў касіць,
Сама запрагае коні…
Партрэт на сцяне вісіць –
Такім маладым яго помніць.

- Знайдзіце ў вершы словы, напісанне якіх адпавядае правілу “Правапіс літар *і,й,ы*”.
- Выпішыце іх і дапоўніце сваімі прыкладамі.

**Заданне № 4. Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх значэннямі.**

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Вы..сці з-пад пяра | 1. Дамовіцца, пагадзіцца. |
| 2. | Да..сці да вушэй | 2. Пра людзей, якія ўпарта не паддаюцца адзін другому. |
| 3. | Па..сці на свой хлеб. | 3. Прыдумаць штосьці, дадумацца. |
| 4. | Да ладу пры..сці | 4. Пра напісанае кімсьці |
| 5. | Каса  на камень на..шла. | 5. Пачаць жыць самастойна, зарабляць на сябе. |
| 6. | Па..сці ў галаву па розум. | 6. Станавіцца вядомым для кагосьці. |
| 7. | Ад..сці ў нябыт | 7. Набыць вагу, значэнне, зрабіць кар'еру. |
| 8. | Па..сці ўгору. | 8.  Выкарыстацца, знайсці сабе прымяненне. |
| 9. | Пры..сці да памяці | 9. пазнаёміўшыся са становішчам, прызвычаіцца да сваіх абавязкаў. |
| 10. | Па..сці ў ход | 10. Апрытомнець. |
| 11. | Ува..сці ў ролю. | 11. Перастаць існаваць, знікнуць назаўсёды. |

- **Запішыце фразеалагізмы, устаўляючы літары. Растлумачце правапіс устаўленых літар.**

**Заданне № 5. Пры дапамозе прыставак ад-, пад-, за-, па-, аб-  ад прыведзеных слоў утварыце новыя словы. Запішыце ўтвораныя словы, растлумачце правапіс *і,ы,й* пасля прыставак.**

Ісці, іграць, іскрыцца.

**Заданне № 6. Рашыце арфаграфічныя прыклады. Запішыце ў адпаведнасці з арфаграфічнымі правіламі.**

суб + інспектар = …;     сан + інструктар = … ;  супер + інтэлект = …;
дэз + інфармацыя = … ;    мед + інстытут = … ;  пад + іграць = … ;
гіпер + інфляцыя = … ;  контр + ідэя = … ; дэз + інфіцыраваць = … ;
за + іскрыцца = … ; між + інстытуцкі = … ; звыш + імклівы = … ;
з + імправізаваць = … ; пан + ісламізм = … ; перад + інфарктны = … ;
борт + інжынер = … ; спорт + інвентар = … ; над + ішоў = … .